

# Урок 116

Растлумач, як выканалі дзяленне на двухзначны лік.



1. Вызначаю **першае няпоўнае дзялімае**. Вызначаю колькасць лічбаў у дзелі. Знаходжу першую лічбу дзелі.
2. Вызначаю **другое няпоўнае дзялімае**. Знаходжу другую лічбу дзелі.
3. Вызначаю **трэцяе няпоўнае дзялімае** — 0. Знаходжу трэцюю лічбу дзелі — 0.
4. Чытаю адказ — … .

```
-34860|42
 336  |830
 -126
  126
   -0
    0
    0
```

**1.** Вылічы і растлумач.

34 560 : 48     34 720 : 56     18 240 : 38

**2.** Разгледзь узор скарочанага запісу дзялення. Вылічы, выкарыстоўваючы скарочаны запіс дзялення.

```
-34860|42
 336  |830
 -126
  126
    0
```

21 760 : 64     78 020 : 83

21 440 : 67     22 140 : 54

**3.** Для кожнай няроўнасці знайдзі найменшае значэнне зменнай, пры якім гэта няроўнасць будзе правільнай.

$x + 12 > 1000$     $1000 < 962 + y$

$a \cdot 200 > 60\,199$     $750\,000 < 100\,000 \cdot c$

**4.** Параўнай.

3750 + 1970 ? 6000     10 700 + 24 800 ? 30 000

2890 + 6550 ? 10 000     33 600 + 20 800 ? 50 000



Правообладатель Национальный институт образования

5. За дзень было прададзена 90 бутэлек квасу. З кожных 10 бутэлек было 6 бутэлек цёмнага квасу, у астатніх бутэльках быў светлы квас. Колькі бутэлек квасу кожнага віду было прададзена?

6. Прайшла шостая частка высакоснага года. Колькі дзён гэтага года прайшло? Колькі засталося?

7. Дапамажыце аграному вызначыць перыметр усяго поля і плошчы ўчасткаў, адведзеных пад агародніну кожнага віду. Выкарыстоўвайце даныя плана.




Выберы правільную роўнасць.

25 370 : 43 = 59    25 370 : 43 = 590

1. Вылічы. Вынік правер множаннем.
21 440 : 32    36 750 : 49    34 160 : 56

2. Адлегласць паміж двума гарадамі — 540 км. З гэтых гарадоў у поўдзень насустрач адна адной выехалі дзве машыны са скарасцямі 95 км/г і 85 км/г. Праз які час і а якой гадзіне машыны сустрэнуцца?



Правообладатель Национальный институт образования